противовес им иезуитов. Это способствовало активному строительству храмов, которые мы можем видеть и сегодня. Во время нахождения района в составе Российской империи происходило насаждение православия. Особенно ярко это проявилось после восстания 1863-1864 г. Это ударило в первую очередь по позициям католицизма. Снова свое господствующее положение католики возвращают после Рижского мирного договора. Наиболее трагической страницей конфессиональной истории Сморгонщины стал период гонения на религию во времена советской власти. Это привело в первую очередь к уничтожению одних из самых интересных памятников храмовой архитектуры. Активное восстановление и строительство новых храмов начинается лишь с распадом Советского Союза.

ЛИТЕРАТУРА

1. Камінскі, А. Крэўскае сняства і яго ўладары / А. Камінскі // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 44 – 49.
2. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А.М. Кулагін. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 488 с. : іл.
3. Камінскі, А. Смаргонь і яе ўладары / А. Камінскі // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 53 – 60.
4. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII – XVIII вв. Владение Сморгонь. – Минск : Наука и техника, 1977. – 256 с.
5. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi / K. Tyszkiewicz. – Drezno : drukiem i naklabem J.I. Kraszewskiego, 1871. – 372 s.
6. Майсевіч, В.Ф. Езуіты ў Жодішках / В.Ф. Майсевіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 64 – 66.
7. Татары ў Беларусі. Іх рэлігія / І. Канапацкі // Беларус. гіст. часопіс. – 1996. – № 2. – С. 13 – 25.
8. Сарокіна, І. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / І. Сарокіна. – Вільня : ЕГУ, 2010. – 488 с.
9. Клуйша, М.К. Помнікі праваслаўнага дойлідства / М.К. Клуйша // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 573.
10. Касцёл Святога апостала Тадэвуша ў аг. Вішнева. Помнік архітэктуры класіцызму [Электронны рэсурс] // Установа культуры “Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей”. – 2011. – Рэжым доступу: http://museumsmorgon.by/area_monuments.htm#Касцёл_Святога_апостала_Тадэвуша_ў_а. Вішнева. – Дата доступу: 10.09.2015.
11. Маркава, Н. Кальвінскі збор – раней і цяпер / Н. Маркава // Светлы шлях. – 2012. – 2 сак. – С. 4.
12. Касцёл Святой Тройцы ў в. Данюшава [Электронны рэсурс] // Установа культуры “Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей”. – 2011. – Рэжым доступу: http://museumsmorgon.by/Касцёл_Св_Тройцы_в. Данюшава. – Дата доступу: 08.09.2015.
13. Конфессиональная обстановка в Сморгонском районе [Электронный ресурс] // Сморгонский районный исполнительный комитет. – Сморгонь, 2015. – Режим доступа: http://smorgon.grodno-region.by/ru/social/new_url_1843637528. – Дата доступа: 20.09.2015.

**УДК 94:351.862.21 (476) |638|**

## ЗЕМЛЯНЫЯ АБАРОНЧЫЯ ЗБУДАВАННІ ГАРАДЗІШЧАЎ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ Ў ВЯРХОЎЯХ Р. ВІЛІЯ І БЯРЭЗІНА (ДНЯПРОЎСКАЯ)

***І.С. КАМІНСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.У. ДУК)***

*Даецца характарыстыка земляных абарончых збудаванняў гарадзішчаў жалезнага веку ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская). Адзначаецца залежнасць узроўню фартыфікацыі ад урадлівасці глебы і шчыльнасці насельніцтва вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) у жалезным веку.*

Паняцце фартыфікацыі гарадзішча ўключае сістэму земляных і драўляных умацаванняў падпарадкаваных пэўнай планіроўцы. Стварэнні тыпалогіі гарадзішчаў жалезнага веку днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур В.І. Шадыры, А.М. Мядзведзева, Егарэйчанкі паказваюць рознаварыянтнасць комплексаў умацаванняў, якія залежылі ад выбару месца (узгоркі, мысы, берагі). Асноўным варыянтам умацавання гарадзішчаў з’яўляліся ўзвядзенне штучных земляных умацаванняў (валоў, равоў, падрэзка схілаў). Так, В.І. Шадыра, прааналізаваўшы характар абарончых збудаванняў гарадзішчаў Беларускага Падзвіння (матэрыялы з усёй Віцебскай вобласці), да гарадзішчаў без штучных умацаванняў адносіць 12 паселішчаў (7,4 %). А.М. Мядзведзеў, ствараючы класіфікацыю гарадзішчаў Беларускага Панямоння з прыцягненнем матэрыялаў з Сярэдняй Беларусі, да гарадзішчаў без умацаванняў адносіць 43 паселішчы (20,5 %). Найбольш пашыраным варыянтам абароны пасяленняў

днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур з'яўляляліся гарадзішчы ўмацаваныя адным валам (у тым ліку з рвом). Так, для Беларускага Падзвіння адзначаныя гарадзішчы складаюць 47,5 % ад агульнай колькасці гарадзішчаў. У межах культуры штрыхаванай керамікі гарадзішчы з адным валам з напольнага боку складаюць 30 % і 9% з кальцавым валам. Для гарадзішчаў Беларускага Панямоння уласціва малая абароненасць гарадзішчаў [1, с. 18-19]. Для гарадзішчаў Беларускага Падзвіння характэрна вялікая колькасць гарадзішчаў з моцнай сістэмай умацаванняў (43,1 %) [2, с. 16].

У вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна асноўная колькасць гарадзішчаў была ўмацавана адным валам (57,1 %). У тым ліку адно гарадзішча з тэрасай (Варганы) і два гарадзішчы з рвом (Баравыя, Беразіно). Гарадзішчы з моцнай сістэмай земляных умацаванняў складаюць 28,4 %. З іх два гарадзішчы маюць два валы (Асінавік, Баравічы) і два гарадзішчы (Бірулі, Равячка) маюць тры валы. Гарадзішчы без валоў і равоў (Гарадзішча (Бярозаўскі с/с), Латыголь) складаюць 14,3 % ад агульнай колькасці гарадзішчаў. Такім чынам, асноўная колькасць гарадзішчаў мела штучныя земляныя ўмацаванні. Гардзішчы вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна адлюстроўваюць тэндэнцыю да змяншэння колькасці гарадзішчаў з моцнай сістэмай умацаванняў і павелічэнне колькасці гарадзішчаў з адным валам. Улічваючы характар вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна як кантактнай зоны днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур і змяншэнне колькасці гарадзішчаў з моцнай сістэмай умацаванняў дае падставу меркаваць аб пераважна мірных стасунках паміж носьбітамі адзначаных археалагічных культур на даследуемай тэрыторыі.

Абарончыя збудаванні з'ўляліся часткай планіроўкі гарадзішча. Для гарадзішчаў усіх культур жалезнага веку харатэрна эвалюцыя ад простых земляных умацаваанняў да складанай сістэмы фартыфікацыі [1; 2; 3; 4; 5]. Развіццё планіровачнай структуры гарадзішчаў у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна адпавядае аноўным этапам развіцця фартыфікацыі гарадзішчаў днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур.

Найбольш раннім метадам стварэння земляных умацаванняў на гарадзішчах з'яўлялася павелічэнне стромкасці схілаў (эскарпіраванне). У вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна да гарадзішчаў з такім варыянтам фартыфікацыі адносяцца гарадзішчы Гарадзішча (Бярозаўскі с/с, Докшыцк р-н) [6, с. 250], Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с, Докшыцкі р-н), Варганы (Докшыцкі р-н), Бірулі (Докшыцкі р-н) і інш. Выключна падрэзкай схілаў абмяжоўваліся земляныя ўмацаванні на ранніх гарадзішчах (Гарадзішча (Бярозаўскі с/с)). Эскарпіраванне схілаў таксама вядома на позніх гарадзішчах у сістэме з іншымі абарончымі збудаваннямі (на Варганах з тэрасай, на Бірулях з рвом і тэрасай). Такім чынам, эскарпіраванне схілаў гарадзішча з'яўлялася ўніверсальным метадам фартыфікацыі пасялення, які існаваў ад пачатку ўвядзення земляных абарончых збудаванняў да канца жалезнага веку.

Найбольш распаўсюджаным тыпам земляных абарончых збудаванняў гарадзішчаў вярхоўяў р. Вілія і Бярзіна з'яўлялася ўзвядзеденне аднаго вала. Разам з гэтым, выключна адным валам умацаваны 4 гарадзішчы (28,4 % ад агульнай колькасці гарадзішчаў). На гарадзішчах Баравыя (правы бераг р. Сэрвач) [7, с. 140], Беразіно (правы бераг р. Бярэзіна) [8, с. 102], Варганы (вярхоўе р. Сэрвач), Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с, правабярэжжа р. Сэрвач) вал знаходзіцца ў сістэме з іншымі варыянтамі земляных абарончых збудаванняў. Так, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с) знаходзіцца на пагорку, вышыня якого з паўночнага боку дасягае 13 м, з паўднёвага – 6 м, з усходняга – 5 м. Паўночны, заходні і паўднёвы схілы стромкія. Найбольш абароненай была паўночная частка гарадзішча. Схіл даўжынёй каля 30 м трохступеньчаты з штучна падрэзанымі краямі (зараз месцамі аплыўшымі). Паміж першым і другім парогамі прасочваецца тэраса, якая была ўтворана пры падрэзцы схіла. Абарончых земляных збудаванняў на заходнім схіле не выяўлена, аднак магчыма іх не захавалася. На паўднёвым краі пляцоўкі захаваліся рэшткі ўнутраннага вала вышынёй да 0,3 м шырынёй – каля 1м, даўжыня захаваўшыйся часткі – каля 6 м. Магчыма ён дугой (паўднёвы-захад – поўдзень – паўднёвы-ўсход) агінаў пляцоўку, паколькі гарадзішча з гэтых бакоў, у адрозненні ад паўночнага схілу, было менш абаронена, аднак невялікі ўнутраны вал са спадзістага заходняга краю пляцоўкі мог быць зрэзаны падчас сельскагаспадарчых работ. Усходняя частка вала зараз абмяжоўваецца спускам на паўднёва-ўсходнім схіле гарадзішча.

Асновай фартыфікацыі гарадзішча Варганы з'яўляліся падрэзаныя схілы гары вышыня якой дасягае 40 м. У выніку эскарпіравання верхняй часткі гары, схілы набылі большую круцізну і утварыліся тэрасы. Першая тэраса была ўтворана пры падрэзцы схілаў перад пляцоўкай (мал. 1).

Тэраса пачынаецца ад узвозу на паўночным-усходзе і агінае пляцоўку памерам 60Х50 м дугой з поўначы на паўднёвы ўсход. У паўднёва-заходняй частцы назіраецца павышэнне тэрасы да ўвахода ў адпаведай частцы гарадзішча і страта яе формы. Далей тэраса працягваецца дугой паўднёвы-захад – паўднёвы-ўсход. На паўднёвым-ўсходзе тэраса пашыраецца. Ніжэй знаходзіцца пакаты схіл. З боку

поўдзень - паўднёвы-захад на краі тэрасы прасочваецца вал. Сучасная вышыня вала вагаецца на ўзроўні 1 м, шырыня ў аснове – 3-4 м, даўжыня каля 10 м. Ніжэй вала знаходзіцца другая тэраса. Па даўжыні тэраса адпавядае даўжыні вала, што дае падставу меркаваць аб сувязі узвядзення вала і тэрасы. Схіл паміж валам і тэрасай штучна падрэзаны. Паміж паўднёвым-усходам і паўночным-усходам схіла гары тэраса адсутнічае. Гэта абумоўлена прыроднай стромкасцю схіла.



Мал. 1. Выгляд з захаду на тэрасу і падрэзку схіла на гарадзішчы Варганы (фотаздымак аўтара)

Да гарадзішчаў з моцнай сістэмай земляных умацаванняў аднесены пасяленні, абароненыя двумя і больш валамі, якія знаходзяцца ў сістэме з іншымі тыпамі земляных умацаванняў (Асінавік, Баравічы, Бірулі, Равячкі). Так, гарадзішча Бірулі ўмацавана трымя валамі. Два знешнія валы абараняюць гарадзішча з поўначы і захаду. Унутраны вал знаходзіцца на поўначы пляцоўкі. Паміж пляцоўкай і знешнімі валамі пракапаны роў (глыбіня 2,3 м, шырыня 10-12 м). На ўсходзе прасочваецца тэраса шырынёй 3-3,5 м. З усходняга і паўднёва-ўсходняга бакоў да гарадзішчы прымыкае забалочаная пойма воз. Медзазол. Тры валы на гарадзішчы Равячкі знаходзіліся ў сістэме з трымя равамі. Гарадзішча Асінавік было абаронена двумя кальцавымі валамі і равамі [1, с. 78; 9, с. 244; 10, с. 108; 11, с. 242].

Часткай планіроўкі гарадзішча з’яўляўся ўзвоз. Узвоз быў узаемазвязаны з фартыфікацыяй гарадзішча. Так, узвоз на гарадзішчы Бірулі праходзіў праз калідор утвораны двумя знешнімі валамі на поўначы і цягнуўся ў паўднёвым напрамку па рву да ўваходу ў заходняй частцы пляцоўкі. З захаду ўзвоз быў абаронены валам, з усходу знаходзіцца прадаўжэнне рва, які быў выкапаны паміж знешнімі валамі і пляцоўкай. З поўначы - паўночнага-захаду пляцоўка дадаткова ўмацавана ўнутраным валам.

Галоўны ўваход на гарадзішча Варганы знаходзіўся ў паўночна-ўсходняй частцы пляцоўкі. З захаду да ўзвоза прымыкае тэраса. Адсюль узвоз цягнуўся ў паўночна-ўсходнім напрамку па пакатым схіле. Ніжэй узроўню тэрасы, з захаду і усходу да ўзвозу прымыкаюць адтатыповыя паглыбленні і узвышшы 0,2-0,3 м, якія магчыма з’яўляюцца рэшткамі аплыўшага вала. Уваход на гарадзішча ў паўднёва-заходняй частцы пляцоўкі быў звязаны з паўднёвай тэрасай. Узвоз быў абаронены валам на паўднёва-заходнім краі паўднёвай тэрасы. Такім чынам, на гарадзішчы Варганы існавала два ўзвозы. Паўночна-ўсходні ўзвоз звязаны з перыядам існавання пасялення жалезнага веку. Паўднёва-заходні ўзвоз, магчыма, быў звязаны з селішчам каля паўднёвай падэшвы гарадзішча. Стромкаць паўднёвага схіла і вялікая вышыня гары абумовілі ўключэнне ў сістэму ўзвоза паўднёвай тэрасы

Такім чынам, агульнай рысай для ўзвозаў з’яўляецца іх абароненасць. Разам з гэтым, існуе тэндэнцыя да стварэння ўзвоза ў найбольш зручным для пад’езду месцы. Так, на гарадзішчы Варганы узвоз праходзіў па пакатых, у параўнанні з іншымі, паўночна-ўсходнім і паўднёва-ўсходніх схілах, на гарадзішчы Бірулі ўзвоз цягнуўся з напольнага боку. Аднак пакатыя схілы і напольныя бакі гарадзішчаў

не мелі натуральных перашкод. Гэта прыводзіць да ўзвядзення штучных земляных ўмацаванняў. Адпаведна ўзвоз уключаецца ў сістэму фартыфікацыі пасялення як адзін з умацаваных элементаў планіроўкі гарадзішча.

Неабходна адзначыць, што тапаграфічныя сляды ўзвозаў жалезнага веку захоўваюцца не на ўсіх гарадзішчах. Так, выклікае цяжкасці ўстанаўленне месца ўзвозу на гарадзішчы каля в. Гарадзішчы (Ваўкалацкі с/с, Докшыцкі р-н). Пляцоўка авальнай формы памерам каля 75Х55 м (выцягнута з поўдня на поўнач), пэўны час разворвалася, але зараз зарасла дзёрнам. Сляды ўвахода на гарадзішча знаходзяцца на паўднёва-ўсходнім краі пляцоўкі. У такім выпадку ўзвоз абараняўся прыродным пагоркам з усходу гарадзішча, стромкім усходнім схілам і унутраным паўднёвым валам. Аднак дакладнае ўстанаўленне месца ўзвоза жалезнага веку, улічваючы разворванне пасялення і добрую захаванасць паўднёва-ўсходняга ўвахода, немагчыма без правядзення археалагічных раскопак. Магчыма толькі выказаць меркаванні аб яго месцазнаходжанні. Паколькі ўзвоз павінен знаходзіцца ў зручным для пад’езду месцы, то ўваход на гарадзішча мог праходзіць па пакатым заходнім схіле. Аднак узвоз быў звязаны з фартыфікацыяй гарадзішчаў. На пакатым заходнім схіле не выяўлена штучных земляных умацаванняў. Верагодна, яны маглі не захавацца, што даволі характэрна для земляных умацаваняў на паверхні гарадзішча [3, с. 61]. Такім чынам, для дакладнага вызначэння месца ўзвоза на ўзгаданым гарадзішчы неабходна вызначыць час стварэння ўвахода ў паўднёва-ўсходняй частцы пляцоўкі і характар умацаванняў заходняй часткі пляцоўкі.

Такім чынам, штучныя земляныя ўмацаванні ўзводзіліся ў найменш прыродна аброненых месцах. Гарадзішчы з развітой сістэмай умацаванняў знаходяцца ў Бірульскай (Бірулі), Вітунічскай (Асінавік) і Равячкаўскай групах (Баравічы, Равячкі). Пры гэтым, усе гарадзішчы Равячкаўскай групы адносяцца да тыпу гарадзішчаў з моцнай сістэмай умацаванняў (2 валы і больш). Для нармальнага функцыянавання пасяленняў жалезнага веку, пры панаванні падсечна-агнявога земляробства, адлегласць паміж імі павінна складаць 10 км. Гэтаму паказчыку адпавядаюць гарадзішчы Малышкаўскай, Бірульскай і Варганскай груп. Шчыльнасць гарадзішчаў Равячкаўскай групы большая за шчыльнасць гарадзішчаў суседняй Малышкаўскай групы. Пры гэтым у межы абедзвюх груп уваходзяць дзярнова-падзолістыя глебы на супесках. Аднак на тэрыторыі Равячкаўскай групы і вакол гарадзішча Бірулі іх колькасць абмежавана. Існаванне моцнай сістэмы ўмацаванняў на гарадзішчы Асінавік абумоўлена высокай шчыльнасцю гарадзішчаў Вітунічскай групы. Такім чынам, утварэнне гарадзішчаў з моцнай сістэмай абарончых збудаванняў залежыла ад урадлівасці глебы і шчыльнасці заселенасці адпаведнага рэгіёна. Недахоп урадлівых глеб (дзярнова-падзолістых на сулінках) абумоўліваў павелічэнне шчыльнасці насельніцтва на найбольш ўрадлівых глебах засяляемага рэгіёна (дзярнова-падзолістых на супесках). Гарадзішчы з моцнай сістэмай умацаванняў знаходяцца на тэрыторыях з абмежаванай колькасцю дзярнова-падзолістых глеб на супесках.

ЛІТАРАТУРА

1. Медведев, А.М. Белоруское Понеманье в раннем железном веке (1тысячилетие до н.э. – 5 в. н.э.) / А.М. Медведев. – Минск, 1996. – 200 с. : ил.
2. Шадыра, В.І. Беларускае Падзвінне (І тысячагддзе н.э.) / В.І. Шадыра. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 150 с. ; іл.
3. Егорейченко, А.А. Культуры штрихованной керамики / А.А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207. : ил.
4. Звяруга, Я.Г. Беларускае Павілле ў жалезным веку і раннім сярэднявякоўі / Я.Г. Звяруга // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Вып. 10. – 2005. – 174 с. ; іл.
5. Митрофанов, А.Г. Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н.э. – VIII в. н.э.) / А.Г. Митрофанов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с. : ил.
6. Мітрафанаў, А.Р. Гарадзішча / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус.. сав. энцыкл., 1985. – С. 249-250.
7. Звяруга, Я.Г. Баравыя / Я.Г. Звяруга // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1985. – С. 140.
8. Ільюцік, А.У. Беразіно / А.У. Ільюцік // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 102.
9. Мітрафанаў, А.Р. Асінавік / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1985. – С. 244.
10. Кенька, П.М. Бірулі / П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 108-109.
11. Мітрафанаў, А.Р. Равячкі / А.Р. Мітрафанаў // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 242.